УДК 271.4-9(476)"15":929*І.В.Руцкі;94(476)"15"
DOI 10.31654/2520-6966-2018-10i-92-37-47

**С. Ф. Верамееў (С. Ф. Веремєєв)**
кандидат історичних наук, доцент кафедри історії слов’ян і спеціальних історичних дисциплін Гомельського державного університету імені Франциска Скорини

# Мітрапаліт Іосіф Вельямін Руцкі і Яго Роля ў гістарычным развіцці Беларусі

*У даній статті представлені основні біографічні відомості про митрополита Йосипа Руцького. Характеризується його внесок у розвиток традиції східного чернецтва на білоруських землях. Руцький ініціював у 1617 р. чернечу реформу, в результаті якої був створений базиліанський орден. Митрополит є автором його статуту. Відзначається, що в подальшому базиліанський орден став оплотом Унійної церкви.*
*У статті розглядається роль Руцького в розвитку освіти на білоруських землях. Митрополит Руцький виступив з ініціативою створення "руської" системи освіти в рамках Унійної церкви. Він заснував уніатські школи в ряді населених пунктів Білорусі. Школами повинні були монопольно займатися базіліани. У 1615 р уніатські школи були зрівняні в правах з єзуїтськими школами. Руцький також направляв ченців для отримання освіти в Європу. Показана роль митрополита Руцького в підвищенні статусу Унійної церкви в державі та суспільстві. Він домігся включення представників вищого уніатського духовенства до складу Ради ВКЛ. Руцький відстоював позиції Унійної церкви на сеймах, виступав проти відродження альтернативної православної ієрархії, яка виступала проти унії з Римом, і її легітимізації. Автор статті зазначає, що досить успішною була кадрова політика митрополита. Ключові церковні посади займали талановиті діячі (Р. Корсак і ін.). У результаті церковних реформ єпископами могли ставати тільки ченці. Це зміцнювало Уніатську церкву зсередини. Руцький виступив з ініціативою беатифікації полоцького архієпископа Йосафата Кунцевича, убитого в Вітебську в 1623 р. Надалі культ І. Кунцевича набув широкого поширення на білоруських землях.*
*Показана позиція митрополита Руцького у взаєминах уніатів і православних. Руцький закликав до діалогу, мирного вирішення спірних питань. Він виступав з проектом створення патріархату, який би об’єднав уніатів і православних.*
*У статті розглядається місіонерська діяльність Руцького. Відзначається, що в молоді роки він був у Москві, де обговорював плани унії Московської церкви з Римом. Руцький хотів поїхати в Персію як місіонер, але поїздка не відбулася. Як митрополит він направляв місіонерів на Балкани.*
*Автор статті заперечує тезу про те, що Руцький хотів перетворити православних жителів Білорусі в католиків латинського обряду. У висновку*

*зазначається, що діяльність митрополита Йосипа Руцького сприяла зміцненню становища Унійної церкви на білоруських землях.*

***Ключові слова:*** *унія, митрополит, Йосип Велямин Руцький, Київська митрополія, Уніатська церква, білоруські землі, базіліани.*

---

Гісторыя беларускіх і украінскіх земляў першай паловы XVII стагоддзя непарыўна звязана з асобай Іосіфа Вельяміна Руцкага, які ўзначальваў Кіеўскую мітраполію на працягу 24 гадоў (1613–1637) і правёў шэраг рэформаў, прадвызначаўшых далейшае развіццё Уніяцкай царквы. Нягледзячы на маштабнасць яго постаці і здзяйсненняў, як уяўляецца, дзейнасць Руцкага і яго спадчына ў дачыненні да беларускай гісторыі яшчэ цалкам не асэнсаваны. У дадзеным артыкуле мы зрабілі спробу вызначыць, якой была яго роля ў сучасным яму грамадстве і які ўплыў ён аказаў на развіццё ўсходняй хрысціянскай традыцыі на Беларусі.

Будучы мітрапаліт нарадзіўся ў 1574 г. у родавым маёнтку Рута Навагрудскага ваяводства (цяпер гэта в. Дольная Рута Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці Рэспублікі Беларусь). Яго бацькі належалі да шляхты кальвінісцкага веравызнання, але па невядомай прычыне ахрысцілі свайго сына ў праваслаўнай царкве, даўшы яму імя Ян. Руцкі атрымаў бліскучую адукацыю: ён паслядоўна вучыўся ў кальвінісцкай школе ў Вільні, Карлавым універсітэце ў Празе, Вюрцбургскім універсітэце (Баварыя), потым у Грэцкай калегіі св. Афанасія ў Рыме [1, с. 17–19; 2, с. 3–4]. Адукацыю яго ўзроўня не меў ніхто з прадстаўнікоў тагачаснага беларускага духавенства [3, с. 90]. Падчас вучобы ў Празе Руцкі стаў каталіком, а ў Рыме, пераадолеўшы сумненні, прыняў усходні абрад, у якім заставаўся на працягу ўсяго жыцця.

Вярнуўшыся пасля заканчэння Грэцкай калегіі на радзіму, Руцкі выкладаў у семінарыі, заснаванай мітрапалітам І. Пацеем у Вільні, а ў 1607 г. уступіў у манастыр Св. Троіцы ў Вільні, дзе прыняў манаства з імем Іосіф у і святарскае пасвячэнне. Яго далейшая царкоўная кар'ера развівалася імкліва: у 1611 г. ён быў прызначаны каад'ютарам (намеснікам) мітрапаліта Іпація Пацея, а ўлічваючы той факт, што Пацей быў невылечна хворым, Руцкі, фактычна, стаў кіраўніком Уніяцкай Царквы. Пасля смерці Пацея ў 1613 г., Іосіф Вельямін Руцкі становіцца кіеўскім мітрапалітам.

Вельмі значным быў уклад Руцкага ў развіццё і ўдасканаленне традыцыі ўсходняга манаства на беларускіх землях. Яшчэ падчас свайго знаходжання ў манастыры Св. Троіцы ў Вільні ён увёў практыку частага прыняцця Св. Тайнаў, асабліва для тых, хто толькі

пачаў манаскае жыццё. Як святар ён займаўся выхаваннем моладзі ў навіцыяце. Вынікам дзейнасці Руцкага стала павялічэнне колькасці манахаў у манастыры Св. Троіцы, сярод якіх ён карыстаўся вялікім аўтарытэтам [4, с. 1096–1097]. У наступны перыяд намаганнямі Руцкага былі заснаваны новыя манастыры на беларускіх землях: у Быцені, Жыровічах, да ўніі далучыўся праваслаўны манастыр у Мінску [5, с. 62].

Справай усяго жыцця Руцкага стала манаская рэформа. У ліпені 1617 г. у сваім фальварку Новагародавічы мітрапаліт Іосіф склікаў з'езд (капітулу) прадстаўнікоў пяці манастыроў (Віленскага, Наваградскага, Мінскага, Жыровіцкага, Быценскага, на якім была створана Віленская кангрэгацыя Св. Троіцы, аб'яднаўшая вышэйназваныя манастыры ў межах адзінай цэнтралізаванай структуры [6, с. 29]. Гэтая структура вядома ў гістарыяграфіі таксама як ордэн базыльянаў. На беларускіх землях у розныя часы існавала каля 55 базыльянскіх манастыроў [5, с. 65–66].

Руцкі з'яўляўся аўтарам статуту ("Правілы манаскага жыцця") базыльянаў, які спалучаў правілы св. Васіля Вялікага і нормы езуіцкай духоўнасці. Базыльянамі маглі стаць прадстаўнікі розных сацыяльных груп, кожны з іх, згодна сваім уласным здольнасцям, меў магчымасць атрымаць адпаведнае месца ў ордэнскай іерархіі [7]. Стварэнне базыльянскага ордэну стала вынікам рэалізацыі праекта Руцкага па пераадоленні крызісу Уніяцкай царквы. Гэты праект быў ім падрыхтаваны выкладзены яшчэ ў 1605 г. у творы пад назвай "Разважанні аднаго русіна аб выпраўленні ладу грэчаскага абраду" [6, с. 371–380]. У выніку рэформы Руцкага пачаў фарміравацца новы тып манаха, для якога было характэрна актыўнае душпастырства, прапаведніцкая, місіянерская, настаўніцкая, выдавецкая дзейнасць, уменне весці палеміку з апанентамі, багаслоўскія веды [8, с. 111]. Ордэн базыльянаў, створаны мітрапалітам Іосіфам, у далейшым стаў аплотам уніі на беларускіх землях. Невыпадкова, што адной з найпершых мер расійскага ўрада, накіраваных на далучэнне ўніятаў да праваслаўя ў XIX ст., стала паслабленне пазіцый базыльянаў у Ўніяцкай царкве.

Руцкі прыклаў намаганні для развіцця адукацыі на беларускіх абшарах. По яго плану Уніяцкая царква павінна была стварыць сваю ўласную ("рускую") адукацыйную сістэму, якой манапольна займаліся б базыльяне. На першым этапе яе функцыянавання планавалася запрасіць лепшых настаўнікаў тагачаснай Еўропы – езуітаў. Пры жыцці Руцкага "рускія" школы былі заснаваны ў Наваградку (1613 г.), Мінску (каля 1615 г.), Быцені, Полацку, Жыровічах, Барунах,

Чэрэі (каля 1617 г.), Белай, Магілёве (каля 1624 г.). У 1615 г. Папа Павел V зраўняў іх статус з езуіцкімі. У іх мелі магчымасць вучыцца прадстаўнікі розных веравызнанняў, а выпускнікі гэтых школ маглі далей паступаць ва ўніверсітэты. Вучнямі базыльянаў былі як свецкія асобы, так і прадстаўнікі духавенства [3, с. 90–91].

Сістэма ўніяцкай адукацыі лічылася адной з лепшых і праіснавала да 40-х гг. XIX ст., а сам ордэн базыльянаў атрымаў статус "адукацыйнага ордэна" [9, с. 192]. У базыльянскіх школах вучыліся знакамітыя людзі, напрыклад, Сімяон Полацкі. Як адзначае буйнейшы ў беларускай гістарыяграфіі даследчык гісторыі Уніяцкай царквы С. Марозава, уніяцкія школы фарміравалі інтэлігенцыю, садзейнічалі стварэнню новай фармацыі духавенства на беларускіх землях, узрастанню рэлігійнай свядомасці вернікаў [3, с. 94]. Мітрапаліт Іосіф садзейнічаў распаўсюджванню еўрапейскай адукацыі ў беларускім грамадстве. Да 1617 г. ён накіраваў больш за 20 манахаў на вучобу ў папскія калегіі [2, с. 13].

Руцкі імкнуўся ўзвысіць статус Уніяцкай царквы ў дзяржаве, і з гэтай мэтай намагаўся, каб найвышэйшыя ўніяцкія іерархі ўваходзілі ў склад Рады ВКЛ. Дасягнуць дадзенай мэты мітрапаліт здолеў – некалькі прадстаўнікоў Уніяцкай Царквы было ўключана ў склад Рады [5, с. 63]. Сам Руцкі выступаў у абарону існавання ўніі на соймах 1620 і 1622 гг., якія можна назваць антыўніяцкімі. Таксама ён аспрэчваў законнасць аднаўлення ў 1620 г. праваслаўнай іерархіі ў ВКЛ ерусалімскім патрыярхам Тэафанам III. Па прапанове мітрапаліта кароль Жыгімонт III у 1621 г. выдаў загад арыштаваць І. Барэцкага, высвячанага на кіеўскага мітрапаліта, і М. Сматрыцкага, высвячанага, адпаведна, на полацкага архіепіскапа [10, с. 355–359].

Даволі паспяховай была кадравая палітыка мітрапаліта Руцкага. Менавіта пры ім ключавыя царкоўныя пасады занялі таленавітыя асобы: Я. Кунцэвіч стаў полацкім архіепіскапам, Леў Крэўза-Ржэвускі – архімандрытам манастыра Св. Троіцы ў Вільні, а потым смаленскім архіепіскапам, Я. Марахоўскі – уладзімірскім і берасцейскім епіскапам, Р. Корсак – протаархімандрытам базыльянскага ордэна, а пасля смерці Руцкага – яго пераемнікам на чале Кіеўскай мітраполіі. Адзначым таксама, што у выніку рэформ Руцкага царкоўныя пасады (напрыклад, епіскапскія кафедры) мелі права займаць толькі манахі. Гэты прынцып быў замацаваны ў адпаведным прывілеі караля Уладзіслава IV [2, с. 14], і, безумоўна, умацоўваў Уніяцкую царкву знутры, пазбавіўшы яе ад патэнцыйна шкоднага свецкага ўплыву.

Адзначым таксама, што менавіта Руцкі ініцыяваў працэс беатыфікацыі Язафата Кунцэвіча (быў аб'яўлены блажэнным у 1643 г.,

кананізаваны ў 1867 г.) [11, с. 124], культ якога с цягам часу набыў вялікую папулярнасць сярод уніяцкіх вернікаў на беларускіх землях.

У адносінах з праваслаўнымі, якія не прынялі Берасцейскага аб'яднання, Руцкі заклікаў да паразумення, супольнага і мірнага вырашэння ўсіх пытанняў. Вядомы яго заклік "каб Русь не знішчала Русі" [12]. У другой палове 1620-х гг., пасля забойства І. Кунцэвіча, мітрапаліт Руцкі высунуў некалькі ініцыятыў, накіраваных на з'яднанне ўніятаў і праваслаўных у межах ВКЛ, у тым ліку прапаноўваў ідэю стварэння патрыярхата, які б знаходзіўся ў еднасці з Рымам. Аднак гэтыя ініцыятывы скончыліся безпаспяхова, сумесныя саборы праваслаўных і ўніятаў не адбыліся.

Руцкі адыграў важную ролю ў развіцці палемічнай літаратуры. У сваіх палемічных творах ен выступаў як апанент поглядаў айцоў Рэфармацыі: М. Лютэра, Ж. Кальвіна і інш., а пазней – праціўнікаў еднасці Праваслаўнай царквы з Рымам. Прыблізна ў 1607–1608 гг. на старабеларускай і польскай мовах былі выдадзены "Тэзісы" Руцкага, дзе адстойваўся традыцыйны погляд на царкоўныя таінствы, згодна якому гэта не толькі сімвалы ("знаменія"), але рэальныя чыннікі ласкі, з дапамогай якіх Бог ачышчае грахі і дапамагае людзям у іх духовым жыцці.

У адказ на з'яўленне твора "Верыфікацыя нявіннасці" М. Сматрыцкага, у якім абгрунтоўвалася законнасць аднаўлення праваслаўнай іерархіі на тэрыторыі ВКЛ, Руцкі напісаў і выдаў твор "Двайная віна", дзе аспрэчваў вышэйназваныя сцвярджэнні. М. Сматрыцкі ў тым жа годзе апублікаваў "Абарону верыфікацыі", на якую, у сваю чаргу, Руцкі адказаў "Экзаменам абароны". Як адзначае беларускі даследчык Д. Лісейчыкаў, за палемікай Іосіфа Руцкага з М. Сматрыцкім сачыла ўся тагачасная інтэлектуальная эліта ВКЛ, да яе далучыліся і іншыя праваслаўныя і ўніяцкія інтэлектуалы [13, с. 33]. Азнаямленне з творамі Руцкага дае падставу сцвярджаць аб наяўнасці ў яго літаратурнага таленту, што праявілася ў багацці выкарыстоўваемых ім мастацкіх прыёмаў, вобразнасці мовы, паэтычнасці стылю, ужыванні прыказак, сюжэтаў з грэцкай і рымскай міфалогіі. Руцкі меў дачыненне і да з'яўлення твораў іншых аўтараў. Так, у 1617 г. у Вільні быў выдадзены трактат Л. Крэўзы "Абарона царкоўнага яднання", рэдактарам якога з'яўляўся мітрапаліт Іосіф. У 1628 г. пры ўдзеле Руцкага ў Вільні быў выдадзены першы поўны ўніяцкі катэхізіс пад назвай "Наука, яко верити мает каждый, который щитится нареченіем Православия, згодная з Письмом Святым и со святыми учителми церковными, и принятая от Соборное Апостольское Церкви" [14, с. 44, 63].

На нашу думку, няма падстаў лічыць Руцкага чалавекам, які яўна ці патаемна імкнуўся да пераўтварэння праваслаўных жыхароў ВКЛ ў каталікоў лацінскага абрада. Факты сведчаць аб адваротным: у выніку яго намаганняў Папа Урбан VIII у 1624 г. выдаў дэкрэт, які забараняў пераходы з усходняга на лацінскі абрад. Негатыўна ставіўся мітрапаліт і да фактаў навяртання езуітамі моладзі ў "лацінскую" царкву. Руцкі патрабаваў ад езуітаў спыніць гэтую практыку, пагражаючы ў адваротным выпадку забараніць бацькам пасылаць дзяцей у іх школы [12]. Аправяргаў ён абвінавачванні праціўнікаў уніі ў тым, што апошняя прывядзе да знікнення ўсходніх абрадаў і ў сваіх творах, у прыватнасці, у "Разважанні аднаго русіна аб выпраўленні ладу грэчаскага абраду". Ён звяртаў увагу на тое, што Фларэнційскі сабор прызнаў усходнія абрады сакральнымі, а Папа Клімент VIII пасля заключэння Брэсцкай уніі дазволіў і захаваў іх, пагражаючы адлучэннем тым, хто будзе іх знішчаць [6, с. 376–377]. У сваім тастаменце ён выказваў занепакоенасць тым, што багатая шляхта не падтрымлівае Уніяцкую царкву, забываючыся, што яна не меньш важная, чым "Лацінская" царква. Супярэчыць вядомым фактам і тэзіс аб лацінізатарскай і паланізатарскай дзейнасці Руцкага. Змест яго тастаменту, напісаны, дарэчы, на "рускай" мове, сведчыць аб тым, што мітрапаліт аддаваў таксама прыярытэт "рускай" навуцы перад "лацінскай" [13, с. 40].

Яшчэ адзін важны аспект, звязаны з Руцкім – гэта яго місіянерская дзейнасць. У 1605–1606 г. ён ездзіў у Маскву, дзе ў той час правіў Ілжэдзмітрый, і абмяркоўваў магчымасці з'яднання Маскоўскай царквы з Рымам. З Масквы Руцкі імкнуўся паехаць у якасці місіянера ў Персію, аднак гэтая паездка не адбылася. У 1629 г., праз 12 год пасля базыльянскай рэформы, мітрапаліт адправіў у Харватыю манаха Мятода Тарлецкага да так званых "ускокаў" – бежанцаў-сербаў з Асманскай імперыі [2, с. 14]. У "Разважаннях аднаго русіна аб выпраўленні ладу грэчаскага абраду" адзначалася, што манаская рэформа адчыніла б "шлях для дапамогі іншым нашым братам, якія маюць той самы абрад" [6, с. 380]. Манахі-місіянеры павінны былі прывесці да еднасці з Рымам не толькі Масковію, але і вернікаў Валахіі, Малдавіі, Венгрыі, Сербіі, Балгарыі, з мэтай іх падрыхтоўкі планавалася адкрыць місіянерскую семінарыю ў Мінску [15, с. 196]. Як бачым, місіянерскія планы Руцкага былі грандыёзнымі. Калі дапусціць, што яны былі б рэалізаваны, то гэта прывяло б да значнага павелічэння ўплыву ўніяцкай Кіеўскай мітраполіі ў хрысціянскім свеце.

Некаторыя ідэі Руцкага пераўзыходзілі свой час. Практыка частага прыняцця Св. Тайнаў, якую ён ўвёў ў манастыры Св. Троіцы,

паўсюдна ўсталявалася ў Каталіцкай царкве толькі ў XIX–XX ст. Прапанова Руцкага аб стварэнні галін усходняга абраду заходніх каталіцкіх ордэнаў пачаў здзяйсняцца толькі ў 20–30-я гг. XX ст. у Заходняй Беларусі падчас так званай неауніі, калі там з'явіліся езуіты, капуцыны, рэдэмптарысты, студыты і інш., прыняўшыя візантыйскі абрад. У часы посттрыдэнцкага каталіцызму, для якога была характэрна ўпэўненасць у перавазе лацінскага абраду, Руцкі заклікаў да талерантнасці да абраду ўсходняга, аб чым сведчыць яго твор "Пра іншыя сродкі дапамогі Грэкам і Русінам" [6, с. 384].

У Каталіцкай царкве Руцкі і яго дзейнасць атрымалі высокія ацэнкі. Папа Рыгор XV адзначаў "стойкасць пабожнасці і светлы розум" мітрапаліта, які "прысвяціў сябе і ўсе свае сілы годнасці каталіцкай рэлігіі", а яго пераемнік Папа Урбан VIII назваў Руцкага "Атлантам Уніі, Афанасіем Русі" [1, с. 35]. У сваю чаргу, з праваслаўнага боку яго дзейнасць сустракала супраціў, гучалі пагрозы і ў адрас самога Руцкага. У сакавіку 1609 г. віленскі земянін Сямён Шэмбель нават пагражаў яму смерцю [16, с. 83–84]. Улічваючы гісторыю з замахам на жыццё мітрапаліта І. Пацея, падобныя пагрозы маглі быць небезпадстаўнымі.

Падсумоўваючы, адзначым, што Іосіф Вельямін Руцкі аказаў вызначальны ўплыў на сучасны яму стан Уніяцкай царквы, садзейнічаў выхаду яе з крызістага стану і ўзмацненню яе пазіцый у тагачасным грамадстве. Як слушна адзначае С. У. Марозава, рэформы Руцкага надалі Уніяцкай царкве "большую мабільнасць, адаптаванасць да сацыяльна-палітычных умоў Рэчы Паспалітай, спрыялі павышэнню яе аўтарытэта" [3, с. 79]. Манаская рэформа, якую здзейсніў мітрапаліт, мела вынікам утварэнне цэнтралізаванай манаскай структуры, вядомай як ордэн базыльянаў, які стаў у далейшым аплотам уніі на беларускіх землях. Вялікая роля належыць Руцкаму ў развіцці адукацыі, палемічнай літаратуры, пашырэнні асветы. Ён з'яўляўся аўтарам праектаў, накіраваных на далейшае збліжэнне ўніятаў і праваслаўных. Некаторыя яго ідэі і прапановы пераўзыходзілі свой час і былі рэалізаваны толькі праз стагоддзі. З іншага боку, дзейнасць мітрапаліта Руцкага паслабляла пазіцыі праціўнікаў уніі з Рымам з ліку праваслаўных у дзяржаве і грамадстве, таму выклікала іх негатыўную рэакцыю і супрацьдзеянне.

**Літаратура**

1. Назарко І. Київські і Галицькі Митрополити: біографічні нариси (1590–1960). Рим: ОО. Василіани, 1962. 272 с.

2. Підручны П. Мітрапаліт Язэп (Вельямін-Руцкі): ідэя рэформы манаства ва Усходняй царкве і яе рэалізацыя. Берасце: Царква, 2017. 16 с.

3. Марозава С. У. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады). Гродна: ГрДУ, 2001. 352 с.

4. Жукович П. Н. Жизнеописание митр. Иосифа Вельямина Рутского, составленное митр. Рафаилом Корсаком, и сочинение Рутского об улучшении внутреннего строя униатской церкви. *Христианское чтение.* Август-сентябрь 1909. С. 1089–1108.

5. Конан У. Я. Руцкі і станаўленне Уніяцкай царквы. *З гісторыі уніяцтва на Беларусі (да 400-годдзя Брэсцкай уніі).* Минск: Экаперспектыва, 1996. С. 54–71.

6. Підручний П., П'єтночко Б. Василіянські генеральні капітули від 1617 по 1636 рік. Рим–Львів: Місіонер, 2017. Т. 1. 510 с.

7. Климов С. Базилиане на землях Великого Княжества Литовского во второй половине XVIII в. URL: http://belhist.ru/2012/10/sergej-klimov-baziliane-na-zemljah-velikogo/.

8. Казуля С. Праекты манастырскай рэформы ў ранніх творах мітрапаліта Язэпа Руцкага. *Гістарычны альманах.* 2008. Т. 14. С. 94–111.

9. Гарбуль П. І., Рамановіч П. С. Роля Іосіфа Руцкага ва ўмацаванні Уніяцкай царквы ў Рэчы Паспалітай. *Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа:* зб. навук. арт.: у 2 ч. Гродна: ГрДУ, 2009. Ч. 1. С. 191–194.

10. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Вильна,1867. Т. 1.

11. Пануцэвіч В. Сьвяты Язафат, архіяпіскап полацкі. Полацак: Сафія, 2000. 274 с.

12. Марозава С. Берасцейская ўнія і этнічная свядомасць беларусаў. URL: http://www.belhistory.eu/category/1996-t-3-ssh-2/.

13. Лісейчыкаў Д. Мітрапаліт Іосіф Вельямін-Руцкі і яго тастамент. *Асоба і час. Беларускі біяграфічны альманах*. 2010. Вып. 2. С. 33–49.

14. Саверчанка І. Апостал яднання і веры. Минск: Навука і тэхніка, 1994. 72 с.

15. Казуля С. В. Місіянерская дзейнасць ордэна базыльян у першай палове XVII ст. *Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа:* зб. навук. арт.: у 2 ч. Гродна: ГрДУ, 2009. Ч. 1. С. 195–201.

16. Акты, издаваемые Виленскою Археографическою Комиссиею. Т. VIII. Акты Виленскаго гродскаго суда. Вильна, 1875.

**References**

1. Nazarko I. KiYivskI I GalitskI Mitropoliti: bIografIchnI narisi (1590–1960). Rim: OO. VasilIani, 1962. 272 s.

2. Pidruchnyi P. Mitrapalit Yazep (Velyamin-Rutski): ideya reformyi manastva va Ushodnyay tsarkve i yae realizatsyiya. Berastse : Tsarkva, 2017. 16 s.

3. Marozava S. U. Uniyatskaya tsarkva ў etnakulturnyim razvitstsi Belarusi (1596–1839 gadyi). Grodna : GrDU, 2001. 352 s.

4. Zhukovich P. N. Zhizneopisanie mitr. Iosifa Velyamina Rutskogo, sostavlennoe mitr. Rafailom Korsakom, i sochinenie Rutskogo ob uluchshenii vnutrennego stroya uniatskoy tserkvi. *Hristianskoe chtenie. Avgust-sentyabr 1909.* S. 1089–1108

5. Konan U. Ya. Rutski i stannaulenne Uniyatskay tsarkvy. Z gistoryi uniyatstva na Belarusi (da 400-goddzya Brestskay unii). Mn.: Ekaperspektyiva, 1996. S. 54–71.

6. Pidruchniy P. VasilIyanskI generalni kapituli vid 1617 po 1636 rik. T. 1. B. P'etnochko. Rim–Lviv: Misioner, 2017. 510 s.

7. Klimov S. Baziliane na zemlyah Velikogo Knyazhestva Litovskogo vo vtoroy polovine XVIII v. URL: http://belhist.ru/2012/10/sergej-klimov-baziliane-na-zemljah-velikogo/

8. Kazulya S. Praektyi manastyirskay reformyi ў rannih tvorah mitrapalita Yazepa Rutskaga / S. Kazulya // GIstaryichnyi almanah. 2008. T. 14. S. 94–111.

9. Garbul P. I. Rolya Iosifa Rutskaga va umatsavanni Uniyatskay tsarkvyi ў Rechyi Paspalitay. *Hryistsiyanstva ў gistaryichnyim lyose belaruskaga naroda:* zb. navuk. art. U 2 ch. Ch.1. Grodna: GrDU, 2009. S. 191–194.

10. Arheograficheskiy sbornik dokumentov, otnosyaschihsya k istorii Severo-Zapadnoy Rusi. T. 1. Vilna,1867.

11. Panutsevich V. Svyatyi Yazafat, arhiyapiskap polatski / V. Panutsevich. Polatsak: Safiya, 2000. 274 s.

12. Marozava S. Berastseyskaya uniya I etnichnaya svyadomasts belarusau URL: Rezhyim dostupu: http://www.belhistory.eu/category/1996-t-3-ssh-2/.

13. Liseychyikau D. Mitrapalit Iosif Velyamin-Rutski i yago tastament. Asoba I chas. Belaruski biyagrafichny almanah. 2010. Vyip. 2. S. 33-49

14. Saverchanka I. Apostal yadnannya i veryi. Mn. : Navuka i tehnika, 1994. 72 s.

15. Kazulya S. V. Misiyanerskaya dzeynasts ordena bazyilyan u pershay palove XVII st. // Hryistsiyanstva u gistaryichnyim lyose belaruskaga naroda: zb. navuk. art. U 2 ch. Ch.1. – Grodna : GrDU, 2009. – S. 195-201

16. Aktyi, izdavaemyie Vilenskoyu Arheograficheskoyu Komissieyu. T. VIII. Aktyi Vilenskago grodskago suda. – Vilna, 1875.

---

**С. Ф. Веремеев**
кандидат исторических наук, доцент кафедры истории славян
и специальных исторических дисциплин
Гомельского государственного университета имени Франциска Скорины

**Митрополит Иосиф Вельямин Руцкий и его роль
в историческом развитии Беларуси**

*В данной статье представлены основные биографические сведения о митрополите Иосифе Руцком. Характеризуется его вклад в развитие традиции восточного монашества на белорусских землях. Руцкий инициировал в 1617 г. монашескую реформу, в результате которой был создан базилианский орден. Митрополит является автором его устава. Отмечается, что в дальнейшем базилианский орден стал оплотом Униатской церкви.*

*В статье рассматривается роль Руцкого в развитии образования на белорусских землях. Митрополит Руцкий выступил с инициативой создания "русской" системы образования в рамках Униатской церкви. Он основал униатские школы в ряде населённых пунктов Беларуси. Школами должны были монопольно заниматься базилиане. В 1615 г. униатские школы были уравнены в правах с иезуитскими школами. Руцкий также направлял монахов для получения образования в Европу.*

*Показана роль митрополита Руцкого в повышении статуса Униатской церкви в государстве и обществе. Он добился включения представителей высшего униатского духовенства в состав Рады ВКЛ. Руцкий отстаивал позиции Униатской церкви на сеймах, выступал против возрождения альтернативной православной иерархии, выступавшей против унии с Римом, и её легитимизации. Автор статьи отмечает, что довольно успешной была кадровая политика митрополита. Ключевые церковные должности занимали талантливые деятели (Р. Корсак и др.). В результате церковных реформ епископами могли становиться только монахи. Это укрепляло Униатскую церковь изнутри.*

*Руцкий выступил с инициативой беатификации полоцкого архиепископа Иосафата Кунцевича, убитого в Витебске в 1623 г. В дальнейшем культ И. Кунцевича получил широкое распространение на белорусских землях.*

*Показана позиция митрополита Руцкого во взаимоотношениях униатов и православных. Руцкий призывал к диалогу, мирному решению спорных вопросов. Он выступал с проектом создания патриархата, который бы объединил униатов и православных.*

*В статье рассматривается миссионерская деятельность Руцкого. Отмечается, что в молодые годы он был в Москве, где обсуждал планы унии Московской церкви с Римом. Руцкий хотел поехать в Персию как миссионер, но поездка не состоялась. Как митрополит он направлял миссионеров на Балканы.*

*Автор статьи оспаривает тезис о том, что Руцкий хотел превратить православных жителей Беларуси в католиков латинского обряда. В заключении отмечается, что деятельность митрополита Иосифа Руцкого способствовала укреплению положения Униатской церкви на белорусских землях.*

***Ключевые слова:*** *уния, митрополит, Иосиф Вельямин Руцкий, Киевская митрополия, Униатская церковь, белорусские земли, базилиане.*

**S. F. Veremeev**
Candidate of Historical Sciences, Associate Professor, Associate Professor
of the Department of the History of Slavs and Special Historical Disciplines
of the Francisc Skaryna Gomel State University

**Metropolitan Iosif Veliyamin Rutsky and his role in the historical development of Belarus**

*This article presents basic biographical information about Metropolitan Joseph Rutskoi. Characterized by his contribution to the development of the tradition of Eastern monasticism in the Belarusian lands. In 1617, Rutsky initiated the monastic reform, as a result of which the Basilian Order was created. Metropolitan is the author of his charter. It is noted that in the future the Basilian Order became a stronghold of the Uniate Church.*

*The article discusses the role of Rutsky in the development of education in the Belarusian lands. Metropolitan Rutsky initiated the creation of a "Russian" educational system within the framework of the Uniate Church. He founded Uniate schools in a number of settlements in Belarus. Schools were supposed to be monopolized by the Basilians. In 1615 uniate schools were equalized with Jesuit schools. Rutsky also sent monks to study in Europe.*

*The role of Metropolitan Rutsky in raising the status of the Uniate Church in the state and society is shown. He has achieved the inclusion of representatives of the highest Uniate clergy in the Rada ON. Rutsky defended the position of the Uniate Church in the Seimas, opposed the revival of the alternative Orthodox hierarchy, which opposed the union with Rome, and its legitimization. The author of the article notes that the personnel policy of the Metropolitan was quite successful. Key church positions were occupied by talented figures*